# КОМПЕТЕНТНОСТНЫЙ ПОДХОД КАК ОСНОВА МОДЕРНИЗАЦИИ ПОДГОТОВКИ УЧИТЕЛЕЙ НАЧАЛЬНЫХ КЛАССОВ

УДК 378.147

## ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ПЕДАГАГІЧНАЯ РЫТОРЫКА»

**В. У. Азарка, А. С. Васілеўская**

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск, Беларусь, e-mail: nach@bspu.by*

У артыкуле абгрунтоўваецца неабходнасць уключэння ў вучэбныя планы падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў вучэбнай дысцыпліны «Педагагічная рыторыка», раскрываецца змест вучэбнай праграмы па дысцыпліне, аналізуюцца метады і прыёмы выкладання.

*Ключавыя словы:* універсальная кампетэнцыя, камунікатыўная кампетэнцыя, педагагічная рыторыка, вучэбная праграма, метады і прыёмы.

Тыпавым планам спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя», распрацаваным на аснове стандарта вышэйшай адукацыі пакалення 3+, прадугледжана фарміраванне ўніверсальнай кампетэнцыі здзяйсняць камунікацыі ў вуснай і пісьмовай формах на дзяржаўных і замежных мовах для рашэння задач прафесійнага, міжасабовага і міжкультурнага ўзаемадзеяння. Фарміраванню гэтай кампетэнцыі будзе спрыяць выкладанне практычна ўсіх лінгвадыдактычных дысцыплін. Разам з тым мы палічылі мэтазгодным уключыць у план падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў дысцыпліну, якая б вучыла свядома выбіраць моўныя адзінкі ў залежнасці ад сітуацыі, прадумваць стратэгіі і тактыкі моўных зносін, дапамагала засвоіць тэхналогіі стварэння маўлення.

Менавіта таму ў вучэбныя планы 2021 года была ўведзена дысцыпліна «Педагагічная рыторыка», паколькі яна дапамагае студэнтам адаптавацца ў прафесійнай дзейнасці, сфарміраваць адкрытую для зносін асобу, кампетэнтную, здольную да супрацоўніцтва, да маўленчай творчасці, да міжкультурнага ўзаемадзеяння, асобу, якая валодае навыкамі паспяховай камунікацыі [2, с. 4].

Вучэбнай праграмай па дысцыпліне «Педагагічная рыторыка» прадугледжана знаёмства са зместам і задачамі агульнай і педагагічнай рыторыкі, акрэсленне спецыфікі маўленчай дзейнасці настаўніка, выпрацоўка асноўных якасцей культуры маўлення, знаёмства з асновамі публічнага выступлення. Акрамя таго, у змест дысцыпліны ўключаны тэматычны блок, прысвечаны выразнаму чытанню.

У выніку асваення дысцыпліны студэнты павінны ведаць спецыфіку педагагічных зносін; асаблівасці кніжнай і размоўнай формаў маўлення; асаблі-

васці вуснай і пісьмовай формаў зносін; асноўныя віды маўленчай дзейнасці; камунікатыўныя якасці добрага маўлення; этапы падрыхтоўкі публічнага выступлення; спецыфіку падрыхтоўкі да выразнага чытання твораў.

У першакурснікаў павінны быць сфарміраваны ўменні ствараць тэксты розных стыляў і жанраў; будаваць выказванне ў адпаведнасці з нормамі літаратурнай мовы; аналізаваць тэксты розных жанраў; эфектыўна выкарыстоўваць моўныя сродкі ў розных сітуацыях і жанрах педагагічных зносін; аргументавана выкладаць свой пункт гледжання.

Студэнты павінны авалодаць навыкамі аналізу маўлення і выпраўлення памылак; нормамі літаратурнай мовы; навыкамі стварэння і апрацоўкі розных тыпаў тэкстаў; навыкамі адбору і вывучэння матэрыялу па тэме выступлення; навыкамі выразнага чытання.

Аўтары вучэбнай праграма вызначылі два ўзроўні сфарміраванасці кампетэнцыі: парогавы – ствараць на рускай і беларускай мовах граматныя і лагічна несупярэчлівыя пісьмовыя і вусныя тэксты з захаваннем моўных норм, распрацоўваць партытуру выразнага чытання мастацкіх твораў; павышаны – ствараць на рускай і беларускай мовах граматныя і лагічна несупярэчлівыя пісьмовыя і вусныя тэксты з улікам камунікатыўнай сітуацыі, выразна чытаць мастацкія творы розных жанраў.

Асноўнымі сродкамі ацэнкі ўзроўню сфарміраванасці кампетэнцыі павінны стаць не толькі вусныя адказы і тэсты, але і вуснае публічнае выступленне, эсе, выразнае чытанне твораў розных жанраў, заданні на пошук і адбор матэрыялу ў адпаведнасці з прапанаванай тэмай.

Мэты і задачы вывучэння новай дысцыпліны патрабуюць ад выкладчыкаў пошуку спецыфічных формаў правядзення лекцыйных і практычных заняткаў.

Невялікая колькасць гадзін, адведзеных на лекцыйныя заняткі, вымагае прымянення інтэрактыўных прыёмаў выкладання тэарэтычнага матэрыялу. Напрыклад, добрыя вынікі на лекцыйных занятках дае праца з табліцай «Ведаю – хачу даведацца – даведаўся». Запаўняючы калонку «Ведаю» ў самым пачатку заняткаў, студэнты актуалізуюць раней набытыя веды; аналіз запісаў, унесеных у калонку «Хачу даведацца», дапамагае выкладчыку зразумець, на якіх пытаннях варта засяродзіць увагу і раскрыць больш падрабязна; зварот да калонкі «Даведаўся» пасля кожнага тэматычнага блока забяспечвае пастаянную рэфлексію.

Свядомаму засваенню вучэбнага матэрыялу дапамагае і праца па сістэме Эйр Ар Гайд (Anticipation-Reaction Guide), якая дазваляе параўнаць веды студэнтаў да пачатку і пасля лекцыі. На пачатку заняткаў выкладчык прапануе пазнаёміцца з чатырма сцверджаннямі і вызначыць, якія з іх з’яўляюцца праўдзівымі, а якія памылковымі (студэнты адзначаюць іх адпаведна знакамі + і -). Зварот да гэтых жа сцверджанняў пасля выкладу тэарэтычнага матэрыялу і фармулёўка выказванняў тыпу «Раней я думаў, сёння я даведаўся…» павышае якасць засваення інфармацыі, вучыць аналізаваць набытыя веды.

Паколькі будучы настаўнік пачатковых класаў павінен уступаць у камунікацыю як на рускай, так і на беларускай мовах, то з самага пачатку

ўзнікла пытанне, на якой мове будзе весціся выкладанне. Тэарэтычны матэрыял падаецца на беларускай мове, а вось на практычных занятках мова выкладання можа мяняцца. Такая практыка, на наш погляд, стварае добрыя магчымасці да ўдасканалення навыкаў пераходу з адной мовы выкладання на другую, спрыяе знікненню ўнутранага бар'ера, дапамагае фарміраванню білінгвальнай асобы.

Першае, на што робіцца акцэнт у працэсе выкладання дысцыпліны, – выпрацоўка ў студэнтаў навыкаў розных відаў маўленчай дзейнасці – чытання, слухання, гаварэння і пісьма.

Для навучання ўдумліваму і сур'ёзнаму чытанню студэнтам прапануюцца розныя віды аналізу тэксту, пры якіх неабходна вызначыць тэму і ідэю твора, тып і стыль маўлення, выявіць функцыі тых або іншых моўных сродкаў. Практыкаарыентаванасць навучання рэалізуецца і ў тым, што студэнты працуюць з тэкстамі, якія вывучаюцца на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Для фарміравання навыкаў гаварэння і пісьма студэнты ствараюць розныя віды выказванняў як у вуснай, так і ў пісьмовай форме: разважанне на зададзеную тэму, апавяданне па серыі малюнкаў, выказванні розных стыляў і жанраў. Напрыклад, пры паўтарэнні акцэнтуацыйных норм рускай і беларускай моў студэнтам было прапанавана прыдумаць апавяданне са словамі, у якіх яны дапусцілі памылкі ў пастаноўцы націску. Незвычайнасць і складанасць задання заключалася ў тым, што апорныя словы не былі звязаны паміж сабой сэнсава.

Для выпрацоўкі навыку рэфлексіўнага слухання на занятках па рыторыцы праводзіцца гульня «Экзамен» [1]. Перш чым адказаць на зададзенае пытанне, студэнт павінен паўтарыць або пытанне цалкам, або найбольш значную інфармацыю ці выказаць меркаванне пра матывы, якія пабудзілі субяседніка сказаць зыходную фразу. Дарэчы, як паказала практыка, нават дакладна паўтарыць пытанне бывае вельмі складана.

Значная колькасць часу на занятках па педагагічнай рыторыцы адводзіцца на тое, каб студэнты як мага часцей уступалі ў камунікацыю. Гэтаму спрыяе групавая форма работы, выкананне разнастайных творчых заданняў. Абавязковай для ўсіх прысутных на занятках становіцца ўстаноўка на выяўленнне і выпраўленне памылак, дапушчаных студэнтамі пры адказах.

Такім чынам, эфектыўнасць фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі будучых настаўнікаў пачатковых класаў залежыць як ад зместу вучэбнага матэрыялу, так і ад выбару формаў і метадаў працы на занятках. Сфарміраваць асобу, адкрытую да зносін, можна толькі пастаянна стымулюючы яе камунікатыўную актыўнасць.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Вагапова, Д. Х. Риторика в интеллектуальных играх и тренингах / Д. Х. Вагапова. – М. : Цитадель, 2001. – 460 с.
2. Сидорович, З. З. Педагогическая риторика : учеб.-метод. пособие / З. З. Сидорович. – Гродно : ГрГУ, 2016. – 265 с.